Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 ЖНІЎНЯ 2014 г. СУБОТА № 144 (27754) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Паехаць... услед за працай

СТАР.2

Чаму пустуюць музеі летам?

СТАР.5

Суб'ектыўная Грузія

СТАР.6

ДЗЕЦЯМ ДА 18-ці

У СТАЛІЧНЫМ ЦУМе АДКРЫЎСЯ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫ ГАНДЛЁВЫ КОМПЛЕКС

Бялізна і адзенне, абутак і цацкі, школьныя прылады і тавары для немаўлят, а таксама дзіцячае харчаванне і касметыка — усё тое, што раней трэба было шукаць у розных секцыях і нават на розных паверхах Цэнтральнага ўнівермага Мінска, цяпер знаходзіцца ў адным комплексе «Дзіцячы свет». Адкрыўся ён 1 жніўня і стаў самым вялікім і, прынамсі, адным з самых папулярных з аддзелаў ЦУМ «Мінск».

СТАР.3

Фота Надзеі БУЖАН.

Дбайна выкарыстоўваць кожны ўчастак сельскагаспадарчай зямлі

запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка падчас рабочай паездкі ў Мінскую вобласць

Як паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара, кіраўнік дзяржавы наведаў у Мінскім раёне ААТ «Гастэлаўскае». Прэзідэнту расказалі аб ходзе ўборкі збожжавых у краіне і забеспячэнні харчовым збожжам перапрацоўчых прадпрыемстваў рэспублікі. У час рабочай паездкі размова таксама ішла аб забеспячэнні беларускіх аграрыяў сучаснай тэхнікай. Прэзідэнту прадставілі параўнальныя тэхнічныя характарыстыкі камбайнаў айчыннай і замежнай вытворчасці, далажылі аб выніках выпрабаванняў новай мадэлі збожжаўборачнага камбайна, прызначанага для ўборкі палёў з высокай ураджайнасцю.

Фота БЕЛТА.

Работнікаў нашай сельскагаспадарчай галіны неабходна прывучаць працаваць на самым высокім узроўні, адзначыў Аляксандр Лукашэнка ў размове са спецыялістамі. «Трэба зярняткі лепшага, перадавога прывозіць у Беларусь і прывучаць нашых сялян і самім прывыкаць працаваць на самым высокім узроўні»,— падкрэсліў беларускі лідар.

Як далажылі Прэзідэнту, такое дарагое абсталяванне не ўсюды мэтазгодна выкарыстоўваць, паколькі яно можа акупіцца толькі ў перадавых гаспадарках. Калі гэта прыносіць больш грошай, то на гэта трэба арыентавацца,— падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.— Але рабіць гэта трэба акуратна — там, дзе гатовыя гаспадарка, землі, ёсць добрая жывёла».

Прэзідэнт запатрабаваў да наступнай уборачнай кампаніі давесці якасць вырабленых у Беларусі камбайнаў да ўзроўню лепшых замежных аналагаў. «Камбайны,— сказаў Прэзідэнт,— да наступнай уборкі павінны быць не горшыя за нямецкія і амерыканскія». Ён акцэнтаваў увагу на якасці тэхнікі: «Перадайце кожнаму майстру і рабочаму — за якасць будзем вельмі строга патрабаваць. Канкурэнцыя кожны год узмацняецца».

Яшчэ адзін важны аспект — неабходнасць павышэння лакалізацыі ў вытворчасці тэхнікі. «Вазіць сюды імпартныя дэталі, збіраць камбайны і хваліцца потым — нам гэтага не трэба. Мы самі павінны гэта вырабляць, і гэта ваша задача»,— падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэтай восенню мае намер больш падрабязна азнаёміцца з сітуацыяй на «Гомсельмашы».

У ходзе рабочай паездкі Прэзідэнту былі прадстаўлены параўнальныя тэхнічныя характарыстыкі збожжаўборачных камбайнаў айчыннай і замежнай вытворчасці, а таксама распрацаваныя «Гомсельмашам» навінкі. Паводле слоў гендырэктара прадпрыемства Аляксандра Камко, у мінулым годзе былі распрацаваны, выраблены і праведзены прыёмачныя выпрабаванні трох новых узораў збожжаўборачных камбайнаў: адзін малой прадукцыйнасці — 5 кг/сек — і два з павышанай прадукцыйнасцю 14 кг/сек і 16 кг/сек. У новай тэхніцы былы высокі ўзровень лакалізацыі.

Падчас папярэдняй паездкі кіраўніка дзяржавы ў Мінскі раён і азнаямлення з ходам уборачнай кампаніі было даручана ў перспектыве забяспечыць аграрыяў сучаснай айчыннай тэхнікай, здольнай эфектыўна працаваць на палях з высокай ураджайнасцю. Работа такога беларускага камбайна, які пакуль існуе толькі ў адным экзэмпляры, на гэты раз была прадэманстравана Прэзідэнту на ўборцы поля з азімай пшаніцай, дзе ўраджайнасць даходзіць да 100 ц/га. Як адзначыў міністр сельскай гаспадаркі Леанід Заяц, гэта сучасная машына параўнальная з замежнымі аналагамі, але ў 2,6 раза таннейшая, напрыклад, за нямецкія камбайны. Разам з тым ён канстатаваў, што яшчэ ёсць некаторыя тэхнічныя недапрацоўкі, якія выяўлены ў працэсе доследнай эксплуатацыі.

СТАР.2

ЛІЧБА ДНЯ

На 2,9%

павялічылася рэальная заработная плата ў краіне за студзень—чэрвень 2014 года ў параўнанні з аналагічным перыядам года мінулага, паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата ў студзені—чэрвені гэтага года ў параўнанні з адпаведным перыядам 2013-га павялічылася на 20,6% і склала Br5764,8 тыс., у тым ліку ў чэрвені — Br6198,5 тыс., або $610,6. Дыферэнцыяцыя ў аплаце працы работнікаў па відах эканамічнай дзейнасці за студзень—чэрвень склала 4,6 раза (дзейнасць, звязаная з вылічальнай тэхнікай,— Br15443,3 тыс., прадастаўленне сацыяльных паслуг — Br3223,9 тыс.), міжрэгіянальная — 1,53 раза (Мінск — Br7692,3 тыс., Брэсцкая вобласць — Br5013,8 тыс.).

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.08.2014 г.

Долар ЗША	10320,00	■
Еўра	13810,00	▼
Рас. руб.	289,00	▼
Укр. грыўня	837,32	▼

■ З першых вуснаў

Барыс СВЯТЛОЎ:

«КОЖНАЕ КУЛЬТУРНАЕ МЕРАПРЫЕМСТВА З'ЯЎЛЯЕЦЦА ДЛЯ МЯНЕ АДКРЫЦЦЁМ!»

Культура ёсць, таму што ёсць чалавек. І нават калі чалавека ўжо няма, яна можа сведчыць, што ён жыў — і не дарэмна, а пакінуў пасля сябе справы, удасканаліў жыццё сваіх нашчадкаў. Яна ёсць менавіта таму, што чалавеку ўласцівы стваральны пачатак. Культура. Культуролагі пра яе кажуць: «сінонім жыцця». І нездарма ж: па тым, што пакідалі пасля сябе асобныя людзі ці нават цэлыя цывілізацыі мінулага, мы можам меркаваць пра іх асэнсаванае існаванне і спеласць. Культура народаў і краін — сведчанне іх шляху і развіцця, сведчанне іх прысутнасці ў свеце. Гэтыя сведчанні могуць быць розныя — ці то асобныя нейкія з'явы, нават рэчы, адметныя абрады, уласцівыя толькі гэтаму народу, альбо творы мастакоў, літаратараў, музыкаў, якія з яго паходзяць і сталі вядомымі ў свеце, выявы помнікаў, якіх няма больш нідзе… Тое, па чым нас пазнаюць. Тое, праз што мы можам сябе пазіцыянаваць. Пра тое, што ёсць культура сучаснай Беларусі ў свеце, па якой нас могуць пазнаваць, якім чынам яна развіваецца на сучасным этапе, мы разважаем з міністрам культуры Беларусі Барысам СВЯТЛОВЫМ.

— Што значыць «культурны брэнд» у нашай краіне? Ці трэба гэтыя брэнды ствараць?

— Як вядома, адным з брэндаў Беларусі з'яўляецца слуцкі пояс, выраб якога, згодна з адпаведнай праграмай, ужо пачаўся. Хутка яго аналагі і копіі зможа набыць кожны. Добра вядомыя як сімвалы Беларусі Нясвіжскі і Мірскі замкі. Плынь турыстаў да гэтых аб'ектаў не змяншаецца; у дні чэмпіянату свету па хакеі там пабывалі тысячы замежных гасцей. Культурным брэндам я назваў бы наш Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета, вядомы ў свеце, у якім ахвотна выступаюць сусветныя «зоркі» і ў якім працуюць прызнаныя майстры опернага і балетнага мастацтва.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Паняцце «культурны брэнд» найбольш адпавядае сучаснай эканамічнай мадэлі. Яно шматмернае, бо ў яго ўваходзяць гісторыка-культурныя аб'екты і падзеі, помнікі культуры, культурныя з'явы, інфраструктура, музеі, бібліятэкі і г. д. Беларусь — патэнцыйна «брэндавая» краіна з яе ўнікальнымі самабытнымі культурнымі, прыроднымі, гістарычнымі, архітэктурнымі багаццямі. За доўгія гады культурнага развіцця дзяржавы былі сфарміраваныя так званыя «культурныя брэнды», дзякуючы якім наша краіна стала вядомай на міжнароднай культурнай арэне.

У ліку «культурных брэндаў» можна смела называць Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», Беларускія дзяржаўныя ансамблі «Песняры» і «Харошкі», Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі, Нацыянальны акадэмічны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь, Міжнародны музычны фестываль «Залаты шлягер у Магілёве», Міжнародны тэатральны фестываль «Белая вежа», форум тэатральнага мастацтва «ТэАрт», Беларускі міжнародны фестываль тэатраў лялек, кінафестываль «Лістапад», Нацыянальную бібліятэку Рэспублікі Беларусь — і гэта не поўны пералік.

Гэта аб'екты і з'явы нацыянальнай культуры краіны, якія сведчаць пра яе адметнасць і ўзровень сучаснага развіцця, у тым ліку ў мастацкай сферы.

СТАР.4

СВЯТА АДВАЖНЫХ

Дзень дэсантнікаў і сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл адзначаецца сёння ў Беларусі. Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны, святочныя мерапрыемствы пройдуць ва ўсіх злучэннях і воінскіх часцях сіл спецыяльных аперацый краіны.

Дарэчы, гісторыя паветрана-дэсантных войскаў бярэ свой пачатак з 2 жніўня 1930 года, калі на вучэннях Маскоўскай ваеннай акругі пад Варонежам было выкінута на парашутах падраздзяленне дэсантнікаў з 12 чалавек. Гэты эксперымент якраз і дазволіў вайсковым навукоўцам убачыць перспектыву перавагі парашутна-дэсантных часцей, іх велізарныя магчымасці.

Неацэнны ўклад у Вялікую Перамогу ўнеслі воіны-дэсантнікі і ў гады Вялікай Айчыннай вайны. За баявыя заслугі ўсім паветрана-дэсантным злучэнням было прысвоена званне гвардзейскіх. А тысячы салдат, сяржантаў і афіцэраў узнагародзілі ордэнамі і медалямі, 296 дэсантнікаў сталі Героямі Савецкага Саюза.

Вераніка КАНЮТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

КІТАЙ РАСПРАЦОЎВАЕ РАКЕТУ, ЗДОЛЬНУЮ СУПРАЦЬСТАЯЦЬ ПРА ЗША

Кітайскія спецыялісты працуюць над новай міжкантынентальнай балістычнай ракетай «Дунфэн-41» (DF-41), якая будзе абсталявана галаўной часткай, што раздзяляецца, паведамляе кітайская партыйная газета Huanqiu. Як заявіла газеце крыніца ў кітайскім ваенным ведамстве, ва ўмовах умацавання супрацьракетнага патэнцыялу ЗША распрацоўка ядзерных сродкаў дастаўкі трэцяга пакалення з некалькімі боегалоўкамі індывідуальнага навядзення з'яўляецца асноўнай задачай. У артыкуле падкрэсліваецца, што ўмацаванне Кітаем ракетнага патэнцыялу — вымушаная мера ў адказ на разгортванне Злучанымі Штатамі глабальнай сістэмы проціракетнай абароны.

МАЛДОВА ПАЧАЛА ВЫДАЧУ ЭЛЕКТРОННЫХ ВІЗ

Малдова з 1 жніўня запусціла паслугу «электронная віза» (e-Visa), якая дазволіць афармляць кароткатэрміновую візу для ўезду ў краіну ў рэжыме анлайн дзякуючы ўрадаваму парталу evisa.gov.md. Як паведаміла Міністэрства замежных спраў і еўрапейскай інтэграцыі Малдовы, электронная віза з'яўляецца эквівалентам традыцыйнай візы і ўяўляе пісьмовы дазвол, які дае замежнаму грамадзяніну права на ўезд на тэрыторыю Малдовы праз любы пункт перасячэння мяжы. Для атрымання электроннай візы трэба запоўніць заяву ў электронным фармаце, прымацаваўшы да яе пакет неабходных дакументаў.

ІНТЭРПАЛ НЕ ЗНАЙШОЎ ПАДСТАЎ ДЛЯ ВЫШУКУ ЯНУКОВІЧА

Інтэрпал не знайшоў дастатковых доказаў таго, што былога прэзідэнта Украіны Віктара Януковіча пераследуюць на радзіме ў сувязі з крымінальнымі злачынствамі, а не па палітычных матывах. Таму яго прозвішча да гэтага часу не ўнесена ў базу міжнароднага вышуку, паведаміў у інтэрв'ю Deutsche Welle дырэктар украінскага бюро Інтэрпала Васіль Няволя. «Віна Януковіча можа быць даказана толькі пасля таго, як справа пройдзе праз суд»,— падкрэсліў ён. Такога ж погляду прытрымліваецца першы намеснік кіраўніка камітэта па пытаннях барацьбы са злачыннасцю і карупцыяй Вярхоўнай Рады Генадзь Маскаль. Украіна падрыхтавала дакументы для экстрадыцыі Януковіча і звярнулася ў Інтэрпал з просьбай аб'явіць яго ў міжнародны вышук яшчэ ў сакавіку 2014 года.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

АД ПРАЦАГОЛІКА ДА АЛКАГОЛІКА АДЗІН КРОК?

Пад алкагольнай залежнасцю маецца на ўвазе штодзённае ўжыванне спіртных напояў, а таксама працяглыя запоі, выйсці з якіх вельмі складана. Гэтая сувязь была выяўлена падчас нядаўна праведзенага даследавання. Удзельнікі апытання адзначалі, што лічаць алкаголь адзінай магчымасцю зняць стрэс і расслабіцца пасля цяжкага працоўнага дня. Працаголікі ўжываюць алкагольныя напоі часцей, чым людзі, якія не надаюць працы занадта шмат часу. У сувязі з гэтым рызыка развіцця алкагалізму ў працаголікаў узрастае. У людзей, якія працуюць больш за пяцьдзясят гадзін у тыдзень, рызыка алкагалізму павышаецца ў 3,3 раза. У беспрацоўных людзей і хатніх гаспадынь верагоднасць узнікнення залежнасці мінімальная. Калі ж чалавек працуе па 30–40 гадзін у тыдзень, шанц стаць залежным павялічваецца ў 1,5 раза. Аднак каля адной пятай усіх пенсіянераў рэгулярна выпіваюць звыш нормы, кажуць навукоўцы. Прычыны таму — адзінота або нуда.

КОРАТКА

Тры вобласці Беларусі на 1 жніўня пераадолелі мільённы рубеж намалоту збожжа — да Мінскай далучыліся таксама Брэсцкая і Гродзенская.

МНС Беларусі і Дзяржаўтаінспекцыя УУС Мінаблвыканкама рэкамендуюць аўтамабілістам адмовіцца ад далёкіх паездак на аўтамабілі ў выхадныя з-за анамальнай гарачыні.

Сетка платных аўтамагістраляў у Беларусі павялічана з учарашняга дня на 256 км.

У 2014–2017 гадах у Беларусі ўстановяць 160–170 тыс. плацежных тэрміналаў. Расплаціцца карткай можна будзе ў аўтамабілях таксі, на ўсіх СТА, арганізацыях, што аказваюць фізкультурна-аздараўленчыя і спартыўна-масавыя паслугі, у санаторыях, базах адпачынку, аграсядзібах.

У Гродне па ініцыятыве мясцовага Савета дэпутатаў маюць намер выбраць гімн, які на многія гады стане адным з сімвалаў горада над Нёманам. Прыняць удзел у стварэнні гімна прапанавалі ўсім ахвотным.

■ Рэха Першай сусветнай

НАГОДА ЎСПОМНІЦЬ І НАПОМНІЦЬ

У МІНСКУ ЎШАНАВАЛІ ПАМЯЦЬ ГЕРОЯЎ І АХВЯР ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Стагоддзе таму свет упершыню скалануўся ад катастрофы сусветнага маштабу. У жніўні 1914 года практычна ўсе вядучыя дзяржавы аказаліся ўцягнутымі ў Першую сусветную вайну. Баявыя дзеянні працягваліся 1568 дзён і начэй. Полымя вайны закранула і Беларусь. Падчас мітынгу-рэквіему каля мемарыяла ў гонар герояў і ахвяр Першай сусветнай вайны мінчане ўшанавалі памяць тых, хто загінуў у гады ваеннага ліхалецця.

СТАР.2

Фота Надзеі БУЖАН.